Бібліятэка Гомельскага аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Міхась Болсун

# ПАД СУЗОР'ЕМ ДАБРЫНІ

Вершы

Мазыр
КПУП «Калор» г. Мазыр
2012

УДК 882.6-1
ББК 84(4Беи)6-5
Б79

**Редактор**: Владимир Гаврилович

Б79 Міхась Болсун. **Пад сузор'ем дабрыні**. – КПУП "Колор" г. Мозырь, 2012. – 144 с.

ISBN 978-985-6830-43-6

"Пад сузор'ем дабрыні" – чацвёрты зборнік паэта, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі. Пад адной вокладкай змешчаны некаторыя вершы з папярэдніх кніг аўтара, а таксама з нова га паэтычнага сшытка.

Творы прасякнуты душэўнай шчырасцю, любоўю да род най зямлі, людзей, прыроды. Паэт піша таксама пра смешнае і недарэчнае ў нашым жыцці, прыкмячае пэўныя агрэхі ў вер шах калег па пяру.

УДК 882.6-1
ББК 84(4Беи)6-5

ISBN 978-985-6830-43-6

© М. М. Болсун, 2012.
© КПУП «Колор» г. Мозырь, 2012





# МІХАСЬ БОЛСУН

Нарадзіўся 23 лютага 1942 года ў вёсцы Балсуны Чачэрскага раёна. Скончыў факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (цяпер імя Ф.Скарыны) і аддзяленне журналістыкі Мінскай ВПШ.

Працаваў рабочым саўгаса, загадчыкам бібліятэкі, настаўнікам. З 1965 года – на журналісцкай працы. Быў намеснікам рэдактара Чачэрскай райгазеты, галоўным рэдактарам Буда-Кашалёўскай «раёнкі». Доўгі час працаваў старшым рэдактарам і загадчыкам аддзела ў Гомельскім абласным тэлерадыёаб'яднанні.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў.

Адзін з аўтараў шэрагу калектыўных літаратурных альманахаў. Выпусціў паэтычныя зборнікі «Яблыня ў фаце», «Там, дзе задумлівы Сож», «Спатканне з поўняй». З'яўляецца ўкладальнікам паэтычнага зборніка «Далоні цёплыя зямлі». Лаўрэат абласнога літаратурнага конкурсу імя Івана Мележа. Ганаровы грамадзянін Чачэрскага раёна.



# ПАМЯЦЬ ЗА КОЖНЫМ РАДКОМ...

Дзякуй Богу, што чалавеку ніхто не здольны адмовіць у памяці... Таму пра паэта Міхася Болсуна крышачку далей, а пакуль менавіта аб ёй...

О, колькі ў Каўпіце мянтузоў... А ў мясцовых лясах баравікоў... У вёсцы Балсуны нават дзве грыбаварні працуюць.

А вось бацька на паўтара года пасля Перамогі затрымаўся з вайны. Сыну Міхаську на пачатку 42-га лёсам было наканавана нарадзіцца. У яго адсутнасць. Як прызнаць маленькаму хлопчыку ў здарожаным дзядзьку таго, хто падараваў яму жыццё.

Развяжу вузельчык успамінаў,
І радок з-пад ручкі пацячэ.

Лёс не выбіраюць – ён робіць гэта сам. Здавалася б, звычайная вясковая школа. Равеснікі – падранкі мінулай вайны. Нехта з іх так і не здолеў пераадолець страчанае, а вось моцныя духам імкнуліся вырвацца з гэтага кола.

Міхась Болсун убачыў шлях з яго праз авалодванне ведамі:

Мужнелі падлеткі за плугам, з касой,
На крылы ўздымаліся рана.

Хоць і не параўнаць тагачасную вясковую бібліятэку з акадэмічнай, але мудрасць, закладзеная на старонках тоўстых і не толькі ў цвёрдай вокладцы тамоў, не магла не натхніць на спробу падзяліцца з сучаснікамі сваімі пачуццямі. Да таго ж, чаму не паспрабаваць расказаць пра самае дарагое, непаўторнае, перажытае.

Можа з гэтых мясцін
Я паэт і апошні,
Хто ў дарозе жыцця
Сярод дат і падзей
Не забыў Балсуны,
Бор смалісты і пожні,
Дарагіх землякоў –
Найдабрэйшых людзей.

А час выдаўся для творчасці спрыяльны. Першыя спробы пяра былі заўважаны. І Міхась Болсун становіцца карэспандэнтам Чачэрскай раённай газеты. Праца журналіста заўсёды звязана з вандроўкамі. Пад час іх чалавек творчы, незнарок нават для сябе, прыходзіць да думкі: якая ж яна непаўторная і прыгожая родная зямля! Вось хоць бы толькі назвы мясцін прыгадаць. Палам, Каўпіта, Лысуха, Хімліва і г.д.

Значыць, і продкі нашыя былі не абыякавымі да наваколля, адшуквалі кожнаму ўрочышчу, яміне на рацэ, альбо куточку ў лесе непаўторную і ў нечым характэрную назву.

І цяпер, ужо будучы паэтам, Міхась Болсун шчодра дзеліцца з чытачом не толькі назвамі родных мясцін, але і па-мастацку расказвае пра іх непаўторнасць і асаблівасці. А ў выніку, калі ўзгадваеш вершы яго папярэдніх зборнікаў “Яблыня ў фаце”, “Там, дзе задумлівы Сож”, “Спатканне з поўняй”, сапраўдная паэтычная энцыклапедыя Чачэршчыны складваецца. І ўсё таму, што паэт самастойна вызначыў кошт паэтычнага слова:

Слову не дадзена ў вершах схлусіць –
Пылам мільгне і сатрэцца...
...Рад, што жыву я на Белай Русі,
Тут жа і спыніцца сэрца.

Але не толькі мясціны роднай Бацькаўшчыны хвалююць і нахтняюць паэта. Чалавек па натуры няўрымслівы, ён не абыякавы і да тых падзей, што адбываюцца навокал зараз.

Душы чарсцвеюць, нібыта скарынкі,
Гора ў суседа – спагады няма,
Самі імчымся ў заложнікі рынку,
Цёплае слова не скажам дарма...

Лірычная хваля ў творчасці Міхася Болсуна больш стрыманая. Магчыма, гэта ад уласнай няпростай практыкі сямейнага жыцця. А, можа, і наадварот ён не вельмі імкнецца выносіць на суд чытача свае інтымныя пачуцці. Але ж гэта ніколькі не азначае, што паэта не хвалююць самыя запаветныя і часам непрадказальныя ўзаемаадносіны паміж мужчынам і жанчынай. І прыклад таму вершы “Чачаранка”, “Акраверш”, “Растанне”, “Восень жаночых гадоў” і іншыя.



Яшчэ адной адметнасцю паэзіі Міхася Болсуна варта лічыць жанравую разнастайнасць яго твораў. Тут не толькі вытанчаныя грамадзянскія радкі, замалёўкі і абразкі прыроды Чачэршчыны, інтымная лірыка, але і дасціпны гумар, пародыі на сяброў па пяру, з’ездлівая сатыра. Вось толькі адзін кароценькі верш — “Дыпламаваны дурань”.

Без дай прычыны
Злосна бас гудзе,
Бы ў шклянцы, зноў
Віруе бура.
Няма бяды
Найгоршай для людзей,
Чым шэф –
Дыпламаваны дурань.

Не можа не кінуцца ў вочы чытача і моўная напоўненасць вершаў паэта, іх вобразнасць, шчодра рассыпаная на кожнай старонцы. А гэта лепшае пацверджанне таго, што ён многае заўважае вакол сябе, здольны адшукаць самае патрэбнае слова, каб данесці да чытача свае перажыванні. Вось толькі некалькі падобных “залацінак”, без якіх паэзія страчвае свой сэнс: “ірве маланка шэрань хмар...”, “бор загарэў, як курортнік на моры...”,“жарам гарацъ у лістоце суніцы...”, “клён гімнасцёркай хваліцца новай...“, “крылом ружовае зары ўзмахнула ярка раніца...”

І колькі падобных радкоў-вобразаў дапамагаюць чытачу не проста адчуваць, суперажываць, але і бачыць!

...А цяпер, зноў вернемся да паняццяў: памяць і лёс. Журналістыка – прафесія, здольная зацягваць, як вір. Асабліва калі ёй было аддадзена больш як 30 гадоў. Менавіта яна, і паўсядзённасць нашага быту перашкодзілі Міхасю Болсуну прыйсці ў паэзію крыху раней. Але ж, на нашу думку, ён не спазніўся. І тым, што лёсам было наканавана, паспеў падзяліцца. Хочацца верыць, што і надалей ён па-мастацку і шчыра будзе распавядаць аб самым запаветным як сучаснікам, так і тым, хто прыйдзе за намі. Менавіта гэтага ад усёй душы і хочацца пажадаць творцу!

*Алесь Дуброўскі, член Саюза пісьменнікаў Беларусі*

* * *

Мая душа не прагне славы,
Пакуль рака жыцця цячэ,
Мне ў радасць людзі, нівы, травы,
Дарога, што вядзе ў Чачэрск.

Там мой выток,
Мая калыска,
Да болю родная зямля.
Паклон абсягам шчыры, нізкі,
Дзе вершы ў сэрцы я люляў!

Няхай ляціць над краем слова,
Нібыта птах у сіняву,
Не веру ў шчасныя падковы,
Я тым шчаслівы, што жыву!

3.09.2009



# I

## 1999 – 2004

## ЧАЧЭРСКІ КРАЙ

Чачэрскі край – абсяг пад сонцам,
Радзіма продкаў і мая,
Дзе самародкам льецца слоўца
І знак вякоў нясе зямля.

Чачэрскі край – старонка гэта
Пакрыта славай ваяроў
І працай рупнаю сагрэта,
Дзе ніў размах і шум бароў.

Чачэрскі край бярозак белых,
Блакітных сподкаў азярын,
І рэк, што ўдалячынь пабеглі,
І барваў ранішняй зары.

Перад травінкай, краскай кожнай
Гатоў упасці ўдзячна ніц.
Адлётны крык гусей над пожняй
Ва мне тужлівасцю шчыміць.

Чачэрскі край! Тут "мірны" атам
Сарваўся з неба на бяду.



Людзьмі пакінутыя хаты
Ўраслі па вокны ў лебяду.

Ды не скарыўся край няўзгодзе.
Багацце шчырае душы
Жыве стагоддзямі ў народзе,
Як і гасціннасць – без мяжы.

Чачэрскі край з блакітам веснім –
Вясёлы песенны простор.
Як запяюць жанкі ў Палессі –
Падхопіць іх Залескі хор.

Чачэрскі край! Шапчу бясконца
Прызнанне шчырае: люблю
Ўсіх землякоў, жыццё пад сонцам
І продкаў вечную зямлю.

15.10.2003

## У ШПІТАЛІ ІНВАЛІДАЎ ВАЙНЫ

Зліліся тут франты ў фронт адзіны,
Дзе толькі водар лесу, неба сінь.
Гады жыцця адлічвае гадзіннік
На цыферблаце дрогаткіх асін.

А мыліц скрып – як скрып на пераправе,
Наведзенай калісьці пад агнём.
Сівыя ветэраны ратнай справы
Сябруюць і сягоння з мазалём.

У снах шчэ падымаюцца з акопаў,
Пускаюць эшалоны пад адхон,
Сціраюць з твараў зачарнелых копаць,
Крычаць няведама каму: “Агонь!”.

І будзе так заўсёды ў іх, да скону,
У памяці – рады палеглых рот…
Трымаюць ветэраны абарону,
Атакі адбіваючы хвароб.



* * *

Падзей віхурыць замець –
У сэрцы іх сляды…
Касу кляпае памяць,
Пракос вядзе туды,
Дзе пацеркі, як срэбра,
Рассыпаны ў траве,
Дзе састарэла грэбля,
Але стаіць, жыве.
Вярба там мые косы
Штодзень рачной вадой,
Схіліўшыся над плёсам
Зялёнай галавой.
Там раўнадушша крыгі
Растопіць прыгажосць…
Хоць затрымаўся крыху,
Ды ўсё ж я свой – не госць.
Тугу далей адпрэчу,
Туман вазьму ў сябры.
Пайду ў прастор зарэчны
Глядзець агонь зары.
Душой чысцейшы станеш
Сярод лугоў, палян.
Там сам сабе не зманіш, –
Там родная зямля.

## КАЎПІТА

Рака Каўпіта жылкай сіняй
На целе б'ецца Беларусі.
На берагі прыходжу сынам,
Калі і ў радасці, і ў скрусе.
Дзіцячых год маіх калыска.
У цяжкі час была кладоўкай:
У нератах язь срэбрам бліскаў,
І шчупакоў я вудзіў лоўка.
Яшчэ і сёння голас – рэха
Блукае сярод траў, кустоўя.
І хоць даўно адсюль паехаў,
Ды сніцца пах духмяны стога,
Дзе травы-зёлкі, смолкі-краскі
Вярэдзяць сэрца так няўмольна.
І зноў рака дзівоснай казкай
Заве ў блакітнае прыволле.



## ПАМЯЦЬ

Упаў зазімак мне на скроні –
Сняжынак бачацца сляды.
Ляцяць, нібыта хтосьці гоніць,
За небакрай жыцця гады.

І толькі памяці скарбонка
Хавае подыхі падзей.
Гартаю гэтыя старонкі,
Яны – наказы для дзяцей.

Нямала зведаных імгненняў
Змагла б ты, памяць, прыгадаць,
Калі праз багны і сумненні
Свайго жыцця гацілі гаць.

Цяпер каштоўнасці – другія,
За імі ўслед не пабягу.
Мне ўспаміны дарагія,
Іх перадаць сынам змагу.

## ПАМЯЦІ БАЦЬКІ

Лірычных слоў
Мой бацька не казаў,
Калі на ўсходзе
Промняў космы –
Туман на скібы
Рэзала каса,
Збірала пацеркі
Ў пракосы.

Без лішніх слоў,
Ахвотна браў сяўню,
На поле ехаў,
Як на свята,
І даўшы добра
Адпачыць каню,
Руплівa
Рассяваў зярняты.

І слоў залішніх
Ён не гаварыў,
Калі з сякераю
Заўзята
Хадзіў штодзень
Пасля вайны ў бары
І сосны выбіраў
Для хаты.

Звінела хата,
Нібы звон,
У ёй сабраны
Лесу гукі,
Глядзела ў свет
Святлом вакон
І спадзявалася
На ўнукаў.

## ТАЛАКА

Сонца выпіла
Тумана малако.
Сціхнуў бразгат
Ранішні даёнак.
Землякі будуюць
Хату талакой –
Даўняя з вясковых
Завядзёнак.
І кладуцца промні
Шчодра на вянкі
Разам з мохам,
Што ў бары сагрэты.
Спыніцца прахожы,
Гляне з-пад рукі:
"Бог у помач!"–
Прагучыць пры гэтым.



## ЧАРНОБЫЛЬ

Чорным болем Чарнобыль
Уварваўся ў наш лёс,
Неспакою мікробы
Нам у сэрцы занёс.

І пытанні кручкамі
Колькі год тут вісяць:
А што будзе тут з намі,
Будуць мо высяляць?

У лес не пойдзеш –
Там цэзій,
Дровы нельга паліць.
І кароў усё меней
Сёння гоняць даіць.

Усё турботы, турботы –
Ад сяла да сяла.
Колькі лішняй работы
Нам нядбайнасць дала?!

## ЛЯ ПОМНІКА Ў ЧАЧЭРСКУ

Бетон і дрэва. Помнік-вежу,
Нібыта з ратушы знялі.
Зірні з яе – не мае межаў
Абсяг чачэрскае зямлі.

Навокал лес сцяной зялёнай,
Азёр люстэркі, рэк шнуркі,
Блакіт квітнеючага лёну,
У жыце спелым васількі.

Буслы над паплавамі кружаць,
І сонца кросны з промняў тчэ…
Стаянка продкаў ля Падлужжа
Не расказала ўсё яшчэ.

З сівых вякоў да дзён сучасных
Падзей пакінут тута след,
Часоў спакойных, самых шчасных,
І самых горкіх, цяжкіх бед.

Чарнобыль – з іх. Дагэтуль стыне
У нашых жылах кроў, бо лёс
Людзей раскідаў па краіне
Ад родных хат, палёў, бяроз.

І сорак тры ахвяры – вёскі
На помнік шчыльна ў спіс ляглі,
Каб назвы іх навек, па-боску,
У сэрцах людзі зберaглі.



## НА МОГІЛКАХ

Магіл фарбую агароджы.
Блакіт кладзецца на крыжы.
Жыццё зямное, як дар божы,
Мой род у клопатах пражыў.

Карэнні радавога дрэва...
Куды ні глянь: груды, груды...
Самотна ціша ля іх дрэмле,
Ля кветак толькі чмель руды.

Сумуе стромкая бяроза.
Вясной блакіт раскіне бэз.
Святое месца-пры дарозе,
Дзе рэчкі стужка, луг і лес.

Парой асенняй неба клінам
Расколе вырай жураўлёў
І скіне скаргу дзеду Кліму
З балот асушаных без слоў.

Лістоў зжаўцелыя аладкі
Прымае могілак трава.
Бабуля спіць мая Паладка –
Умела смерць сыноў трываць.

А побач бацька з маці тута,
Сястра малодшая і брат.
Трывожны чую сэрца грукат,
Зямля спяшыла іх забраць.

...Фарбую моўчкі агароджы.
Блакіт кладзецца на крыжы.
Навокал дзень плыве прыгожы,
Ды смутак-цяжар на душы.

І слёзы высахлі. Не плачу.
Жыцця майго вузее шлях.
Раблю магілам справаздачу
Аб справах добрых і грахах.

17.10.2003

## УСПАМІН ПРА ЧЫРВОНЫ БЕРАГ*

Гудуць натужна лесавозы,
Паўзуць па снезе, па гразі,
Калі дажджамі плача восень,
Калі ўладарыць холад зім.

Тут краны хобатам сталёвым
Кладуць бярвенні ў штабялі,
І пах густы лясоў хваёвых
Парфумай льецца па зямлі.

Дзядзькі сямейныя і хлопцы
Жывуць брыгадай, заадно,
Калі харчуюцца ў сталоўцы –
Масніцы ходзяць хадуном.

Ад жартаў вострых, вострых кпінаў –
На іх ахвочы, здатны люд,–
Як слоўца раптам нехта кіне,
Пачуеш мудрасць, мовы цуд.

Дарма, што ў робах мурзаватых
І копаць на руках ляжыць.
За словам звонкім, зухаватым
Багацце бачыцца душы.

Вясной, калі наўсцяж паводка,
Людзей зарэчных па чарзе,
Бы зайцаў дзед Мазай, на лодках
Тут кожны з гонарам вязе.

Усім так хочацца дахаты
Купіць духмяныя хлябы
І з'есці мякіш наздраваты,
Тады лічы, што тут пабыў.

І так гадамі ў будні, святы
На ўскрайку лесу, ля ракі
Шчыруюць землякі заўзята –
Шафёры, цеслі, леснікі.

---

* *Чырвоны Бераг – рабочы пасёлак на р.Сож каля Чачэрска*

* * *

Непрыгожых жанчын не бывае,
Непрыгожы бывае іх лёс,
Калі квецень душэўная мая
Арашаецца горыччу слёз.

Непрыгожых жанчын не бывае,
Толькі ў вочы пільней зазірні.
Таямніцу калі разгадаеш,
Шмат пабачыш у той глыбіні.

У чарзе магазіннай, на полі
Цябе стрэне жанчыны пагляд.
Раздзялі з ёй усмешку і долю,
Расквітнееш і сам, нібы сад.

Хмель кахання адразу закружыць,
Праляцяць у пачуццях гады,
І жанчына – цудоўная ружа –
Адвядзе ад цябе знак бяды.

## УСПАМІН

Тваіх вуснаў слодыч, бы мядок,
Колісь піў вось тут нясмела,
Ціха ліпа шапацела,
Месяц паглядаў на нас здалёк.

І чысціня пачуццяў першых
У тую ліпеньскую ноч,
Калі сядзела ты наўзбоч,
Гучала ў сэрцы дзіўным вершам.

Снежань 1999 г.



* * *

Пагляд вачэй –
Разліў блакіту.
Усмешка –
Шчырасці прамень.
Цябе пабачыў –
Сон забыты,
Хаджу самотны,
Нібы цень.

Палон пачуццяў
Абцугамі
Сціскае, рве
Маю душу.
За што на сэрцы
Такі камень
Каторы год
Ужо нашу?

А можа хопіць
Моўчкі споўдаць?
Пара развеяць
Сум – імжу.

Як толькі стрэну
Цябе зноўку –
Усё адразу раскажу.

27.12.2003 г.